**17 красавіка на базе ДУА** “Лынтупская сярэдняя школа Пастаўскага раёна” адбыўся семінар-практыкум раённага ВМА настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры па тэме “Адзінства выхаваўчых, навучальных і развіваючых задач як абавязковае патрабаванне да праектавання і правядзення сучаснага ўрока беларускай мовы і літаратуры”.

Мерапрыемства мела на мэце накіраваць метадычную вучобу на пошукі шляхоў удасканалення адукацыйнага працэсу. Пазнаёміцца з вопытам выкарыстання перспектыўных форм, метадаў і прыёмаў навучання, інавацыйных падыходаў у выкладанні прадмета.

Абмеркаваны пытанні “Трыадзіная мэта ўрока (пазнавальная, выхаваўчая, развіваючая) як аснова сучасных навучальных заняткаў (Шчыт Г.П.), “Сістэмнасць і адзінства педагагічных патрабаванняў як ўмова фарміравання цэласнага развіцця асобы навучэнца (Савасцюк В.В.., ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Паставы”), “Пераемнасць у рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу і развіцця асобы вучняў вучэбных і факультатыўных заняткаў па беларускай мове і літаратуры” (Мурзіч А.Г.)

Настаўнікамі наведаны вучэбныя заняткі па беларускай літаратуры ў 6 класе (тэма “Я.Маўр. Апавяданне “Багіра”). Праведзены самааналіз і аналіз вучэбных заняткаў.

Арганізавана правядзенне дыягностыкі.

Для ўдзельнікаў семінара арганізавана экскурсія ў школьны музей (дырэктар школы Кузьмінова Н.В.), касцёл Святога Андрэя апостала, метэастанцыю.




УГОЛОК МЕТЕОРОЛОГА




ОБРАЗОВАНИЕ

